“Сакральная спадчына Панямоння”

Аўтар: Кінга Красіцкая
24.02.2019 00:00

Панямонне – унікальні рэгіён, дзе на працягу многіх стагоддзяў цесна суіснавалі розныя народы, веравызнанні, культуры, якія пакінулі пасля сябе шматлікія матэрыяльныя помнікі. Творы мастацтва, якія дайшлі да нашых дзён, захоўваюцца ў музеях і рэлігійных установах Беларусі. Некаторыя з іх былі прадэманстраваны ў Сенатарскай зале Новага замка ў рамках выставы “Сакральная спадчына Панямоння”. Гэта ўнікальны збор культавых рэчаў, які прадстаўляе хрысціянскія канфесіі нашага краю. Частку экспазіцыі склалі экспанаты, гісторыя якіх звязана з дзейнасцю сясцёр брыгітак у Гродне. Прапануем пазнаёміцца з найбольш цікавымі з іх.



Апостальскі рад

“Хрыстос, Марыя і 12 апосталаў”

Калі манахіні прыходзілі на службу ў касцёл, то займалі месца на хорах. Парапет хораў касцёла Звеставанння Найсвяцейшай Панны Марыі быў упрыгожаны апостальскім радам. Калі выставіць усе іконы адну за другой, атрымлівалася палатно каля 8-мі метраў у даўжыню. Гэтыя абразы размяжоўвалі манахінь і людзей, якія знаходзіліся знізу. У цэнтры палатна – Езус і Панна Марыя, а па баках – 12 апосталаў. Цікава, што вучні Хрыста адлюстраваны з тымі сімваламі, ад якіх загінулі. †




Карціна

“Кляштар брыгітак”, 1927 г.

Дзякуючы гэтаму твору гродзенскага мастака Зыгмунта Буйноўскага можна ўбачыць, як выглядаў касцёл у міжваенны перыяд.


Аўтар: Кінга Красіцкая
24.02.2019 00:00








Аўтар: Кінга Красіцкая
24.02.2019 00:00







“Сакральная спадчына Панямоння”

Аўтар: Кінга Красіцкая
24.02.2019 00:00

